з боку грамадскіх і дзяржаўных арганізацый. У гэтай сувязі важна раскрыць змест тэрміна "кіраванне" ў галіне культуратворчасці, яго функцыянальнага характару, высветліць якаснае адрозненне кіравання ў матэрыяльнай і духоўнай сферах.

Кіраванне нельга разумець у літаральным сэнсе слова як умяшанне ў творчы працэс, падпарадкаванне ўсіх яго элементаў нарматыўным патрабаванням, як сацыяльна-палітычны кантроль над стварэннем твораў мастацтва, іх выкананнем, складаннем праграм, адборам выканаўцаў і г.д.

3. З пункту гледжання асноў навуковага кіравання мастацкімі калектывамі патрабуюцца перш за ўсё глыбокія веды іх асаблівасцей, творчага патэнцыялу, функцыянальнай накіраванасці, прафесійнай падрыхтоўкі, сацыяльных умоў дзейнасці і іншага, што характарызуе той ці іншы калектыў як адзінае цэлае.

Такім чынам, кіраванне як сацыякультурны працэс у сваёй сутнасці мае на ўвазе мэту кваліфікаванай дапамогі, накіраванай на выяўленне ў поўнай меры творчага патэнцыялу калектыву, яго узбагачэнне за кошт стварэння найбольш спрыяльных сацыяльна-эканамічных і творчых умоў. Пры гэтым не трэба забываць аб сацыяльнай абароне творчай асобы і гарантыях творчай свабоды. Сапраўднае навуковае кіраванне павінна выключаць нівеліраванне творчай індывідуальнасці, прымус, канфармізм, сацыяльна-творчы стрэс, пачуццё страху за няўдачы на творчым шляху.

4. Неабходна перасцерагчы ад разумення кіравання як працэсу, што выключае супярэчнасці і памылкі ў кіраванні. Кіраванне творчымі калектывамі дапускае прысутнасць эўрыстычнага, пошукавага фактару, а гэта патрабуе прызнання як прамой, так і адваротнай сувязі. Адваротная сувязь дапамагае пераканацца ў эфектыўнасці альбо памылковасці кіраўнічых дзеянняў, высвеціць пэўныя пралікі, што дазваляе ўносіць карэктывы ў гэтыя дзеянні, ажыццяўляць перабор варыянтаў. Гэта тым больш неабходна, паколькі калектыў не стаіць на месцы, ён развіваецца, змяняе праграму альбо характар сваёй творчай дзейнасці, а часам тое і другое адначасова.

Намі закрануты толькі некаторыя аспекты навуковых асноў кіравання калектыўнай творчай дзейнасцю. Яна ў перспектыве сустрэнецца з больш сур'ёзнымі, чым зараз, цяжкасцямі, выкліканымі рыначнымі адносінамі. Культура можа выжыць ва ўмовах рынку, калі сістэма кіравання набывае якасна новыя рысы, якія дазваляюць не толькі захаваць яе чалавекатворчы сэнс, але і ўзбагаціць змест.

Бірукова Т.П.,
канд.пед.навук,
дацэнт

## РАЗВІЦЦЁ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ НА ЗАНЯТКАХ ПА КУРСУ "АСНОВЫ СЦЭНАРНАГА МАЙСТЭРСТВА"

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Стратэгія інтэнсіфікацыі і перабудова ўсіх сфер сацыяльнай практыкі запатрабавалі зусім новага падыходу да навучання спецыяліста з вялікім творчым патэнцыялам, мастацка-творчым уяўленнем і асаблівымі псіхарацыялагічнымі ўласцівасцямі асобы.

Арганічнай састаўной часткай прафесійнай падрыхтоўкі сацыяльнага педагога па арганізацыі вольнага часу з'яўляецца авалоданне такім шматпланавым і творчым прадметам, як драматургія разнастайных культурных праграм.

Напісанне сцэнарыя - заўсёды творчы працэс, які патрабуе не толькі валодання "тэхналагічнымі" сакрэтамі, але які дае і магчымасць праяўлення асабістых пазіцый самога аўтара. Найбольшая складанасць заключаецца ў тым, каб студэнт зразумеў зыходнае палажэнне ў гэтым працэсе: любая культурная праграма прадугледжвае дзеянне, якое развіваецца ці ў рамках сюжэта, ці існуе без яго. Уменне пабудаваць гэта дзеянне, укласці ў яго драматургічную насычанасць, каб уцягнуць у дзеянне актыўнага ўспрымання аўдыторыю, складае сэнс паняцця "драматургія культурных праграм па арганізацыі вольнага часу".

Задача курса "Асновы сцэнарнага майстэрства" заключаецца ў тым, каб сфармаваць у будучага сацыяльнага педагога неабходныя ўменні ў драматургічнай арганізацыі матэрыялу, навучыць яго творча вырашаць кожную пастаўленую задачу: хай гэта будзе дзіцячае сямейнае свята, сямейна-гульнявыя конкурсы, кірмашы па продажы цацак ці формы сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі дзяцей, дарослых і г.д.

У дадзеным выпадку мы зыходзім з трох палажэнняў. Па-першае, кожны студэнт у сваёй

будучай рабоце не аднойчы стане сцэнарыстам праграмы ці якога-небудзь віду дзейнасці. Па-другое, не выключана, што кожны студэнт у той ці іншы перыяд сваёй дзейнасці абавязкова будзе вядучым разнастайных культурных праграм. Па-трэцяе, працэс стварэння сцэнарыя неаддзельны ад працэсу ўвасаблення.

Развіццё творчых здольнасцей у студэнта дадзенай спецыялізацыі павінна перш за ўсё прадугледжваць гэтыя аспекты яго будучай дзейнасці. Ажыццявіць пазначанае магчыма рознымі шляхамі, цесна ўзаемазвязанымі. Найбольш дзейсным сродкам з'яўляецца выкарыстанне паміж сабой актыўных метадаў навучання, сярод якіх вядучае месца належыць дзелавым гульням, г.зн. сцэнарнаму трэнінгу.

Сцэнарны трэнінг прадугледжвае прайграванне вызначаных заданняў, практыкаванняў, якія фарміруюць сцэнарныя навыкі і ўменні, дапамагаюць выкананню канкрэтнага сцэнарнага задання (пошукі сюжэта сцэнарыя, задумы, вобразнага яе рашэння і г.д.).

Трэнінг па сцэнарным майстэрстве дае магчымасць карыстацца рознымі методыкамі, якія дапускаюць дзейнасныя калектыўныя зносіны і ўключаюць наступныя асноўныя практыкаванні: сюжэтная і сітуацыйна-ролевая гульні ("сцэнарны эцюд"); прайграванне заданай сюжэтнай структуры; "калектыўныя імправізацыі"; "пошук задумы" - метад групавога пошуку сцэнарнай задумы, яе вобразнага рашэння і інш.

Развіццё творчых здольнасцей па авалоданні сцэнарным майстэрствам - працэс не вузкаспецыяльны, зведзены да ўзроўню навучання "тэхналогіі". Гэты працэс мае на мэце фарміраванне спецыяліста, які творча мысліць.

Бялоў У.І.,
канд.пед.навук,
дацэнт

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ САЦЫЯЛЬНАГА ПЕДАГОГА

1. Адной з важнейшых функцый прафесійнай дзейнасці сацыяльнага педагога сферы арганізацыі вольнага часу дзяцей і падлеткаў з'яўляецца забеспячэнне яго педагагічнай накіраванасці, г.зн. усебаковае выкарыстанне выхаваўчага патэнцыялу шляхам уключэння дзіцячага кантынгента ў працэс самадзейнай творчасці і рацыянальна арганізаванага адпачынку.

У сувязі з гэтым сацыяльны педагог павінен умець:

- арганізоўваць і ажыццяўляць культурную дзейнасць дзяцей і падлеткаў у вольны час у канкрэтным рэгіёне;

- забяспечваць высокі ідэйна-мастацкі ўзровень культурных праграм па арганізацыі вольнага часу;

- аказваць метадычную і практычную дапамогу дзіцячым грамадскім арганізацыям, школьным установам у рацыянальнай арганізацыі адпачынку дзяцей і падлеткаў;

- прагназіраваць і планаваць творчую і метадычную работу;

- вывучаць і абагульняць перадавы вопыт па арганізацыі вольнага часу дзяцей і падлеткаў.

2. Для забеспячэння студэнтаў спецыяльнасці "сацыяльны педагог" прафесійнымі ведамі ў гэтым напрамку адначасова з цыклам сацыяльна-педагагічных дысцыплін вывучаецца курс "Тэхналогія арганізацыі культурнай дзейнасці ў вольны час", распрацаваны выкладчыкамі кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці Беларускага універсітэта культуры.

Мэта курса -- сфарміраваць у студэнтаў сукупнасць прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў для авалодання майстэрствам арганізацыі культурнай дзейнасці ў вольны час з дзецьмі і падлеткамі.

3. Курс уключае адносна самастойныя і разам з тым арганічна звязаныя паміж сабой раздзелы:

1. Выканальніцкае майстэрства:

а) мастацтва слова;

б) беларускі танцавальны фальклор;

в) выканальніцкі трэнінг;

г) беларускі музычны фальклор.

2. Асновы сцэнарнага майстэрства і рэжысуры.

3. Мастацка-музычнае афармленне праграм.

4. Арганізацыя гульнявой дзейнасці.

5. Арганізацыя пазнавальнай дзейнасці.

6. Арганізацыя творчай дзейнасці.

Вывучэнне курса дае магчымасць студэнтам засвоіць тэарэтычныя асновы сцэнарнага май-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ